Цэна асобнага нумэру 5 кап.

# НАША НІВА

**Выходзіць што тыдзень.**

Адрэс рэдакціі і адміністраціі: **Вільня, Завальная вуліца, д. № 7.**

Цэна з перэсылкай і дастаўкай на 1 г. — 2 р. 50 к., на 6 мес. — 1 р. 25 к. на 3 м. — 65 к., на 1 мес. — 25 к. За граніцай: на 1 г. — 4 р., на 6 мес. — 2 р. 3 мес. — 1 р. Перамена адрэсу — 20 коп.

Абвесткі прыймаюцца на апошняй страніцы па 20 кап. за лінейку малымі літэрамі. Рукапісы і карэспандэнціі, прысланые у рэдакцію, павінны быць чытэльна напісаны с праўдзівай фаміліей і адрэсам таго, хто яе прысылае. Можна такжэ надпісаць прэзвішчэ разам з фаміліей, хто не захочэ, каб была надрукавана праўдзівая фамілія. Адрэс і фамілія толькі для ведама рэдакціі. Рукапісы аўторам не вертаюцпа назад.

Год VIII. 1 лютаго 1913 г. №. 5.

## Кантора рэдакціі

просіць усіх, каму пасылалася газэта на павер, пастарацца пры слаць грошы на 1913 год, бо нам дужа цяжка і мы прымушэны будзем стрымаць высылку газэты. Хто ешчэ не аднавіў падпіскі, просім аднавіць.

---

Усім, хто захочэ бліжэй абзнаёміцца з „Нашай Нівай“, прышле свой адрэс і 10 капеек маркамі на перасылку будзем высылаць газэту **адзін месяц дарма.**

---

*1 лютаго 1913 г.*

Як бы поле добра не выраблялі не засевалі, а калі ня будзе дажджу і цёплаго сонца, яно не зазелянее густой руньню; пад восень ня будзе залаціцца, выгінаючыся ад цяжкіх, буйных каласоў. Гэтак нашэ грамадзянскае жыцьцё; жыцьцё усяго краю чэкае новых варункоў, новых устройств, каторых мы ужо восьмы год чэкаем ад Думы. Добра было-б каб хутчэй дачэкаліся. Кажуць, што Расея па троху багацеець; мацнеець, сельская гаспадарка хутка паднімаецца, торг развіваецца, народные капіталы у банках растуць. Можэ гэта і праўда,—земля вялікая; багатая; кажуць сьведамые людзі, што, каб яе добра упарадкаваць, то за колкі год перэгнала-бы Амэрыку.

Аўстрыя зрабіла мобілізацію, гатовючыся да вайны і гэта нагнало такога перапуду на аўстрыякоў, што гандлёва-фабрычнае жыцьцё саўсім станула; скрозь пайшлі банкроцтвы. Такім фабрычным гасударствам, як Нямеччына, Аўстрыя вайна вялікая беда, бо палавіна людзей жывуць з заработку, а не з зямлі. Аўстрыяцкіе газэты пішуць, што Расея такая вялізная; багацьце яе не мае дна, і франт на Невскім праспэкці і мужык, што есць толькі сваю бульбу; не пачуюць вайны, а аўстрыякам ужо ад мобілізаціі цяжка.

---

## У Думе і каля Думы.

Пішуць, што у Думе пусткі і нуда. Німа жыцьця. 25 дэпутатоў падалі прашэньне, каб іх адпусцілі дамоў у отпуск, на атпачынак. Запрацаваліся!

Народ жыве сваім жыцьцём і думкі усіх людзей больш звернуты на тые парахавые тучы, што збіраюцца у Эўропе, а усё іншае адходзіць на другое мейсца.

Дума зрабіла запрос, аб незаконных паступках некаторых губэрнатароў у часе выбароў у Думу, але правые акцябрысты і цэнтр адкінулі срочнасць запроса. Ешчэ быў запрос аб арэстах паліціей гімназістоў у Пецербурзе.

Адказ міністра Кассо нікога нездаволіў.

Гасударственны Савет адкінуў закон, каб кабет дапускаць быць адвакатамі.

---

## Вайна.

На гэтым тыдні непамірыўшыся у Лондоне туркі з баўгарамі пачалі ізноў вайну. Боўгары моцна пачалі абстрэліваць з гармат Адрыанополь, але туркі хоць і аслаблі ад недахвату харчоў і набоёў, усёж такі цьвёрда там сідзяць і не здаюцца. Гарматамі трохі разбурылі старасьвецкі пекны мэчэт (храм мусульманскі). На Чаталджынскіх акопах, што закрываюць дарогу на Константанопаль туркі пробавалі адціснуць баўгар, але гэта ім не удалося. Паводле другіх чутак баўгары узялі, бытцым, 3 форты. Чорнагорцы ізноў пачалі пробаваць узяць Скутары, калі Чорнагорцы там засядуць, то яны будуць спакойны, што Скутары, Аўстрыя не прылучыць да Албаніі.

Туркі усімі сіламі хочуць [illegible]мацца у Эўропе. Султан пазва[illegible]цоў, каб яны аценілі яго абсыпаны дарагімі каменямі трон, каб прадаць яго, калі ня будзе грошы на вайну.

Англія хочэ с пазваленьня Турціі прыслаць свае ваенные караблі у Константанопаль, і гэтай жалезнай рукой, яна можэ умешацца, калі будуць дзяліць Турцію.

---

## Беларускай Моладзі.

Вышла у сьвет ужо другая кніжка «Маладой Беларусі». Гэта кніжка дае ўжо больш. поўны абраз новаго творчэства беларусоў. Поруч з стацьцёй Антона Новіны „К пытаньню аб нацыональных адносінах у Беларусі і Літве“ бачым некалькі вельмі пекных твороў Якуба Коласа, апаведаньне А. Новіча, жменю вершаў Цішкі Гартнаго з надта цікавым апісаньнем яго жыцьця, дзьве рэчы Власта, напісаные з размахам і шчырым гуморам, урэшці—вязанку вершоў Ф. Чэрнышэвіча.

Вітаючы шчыра новае праяўленьне беларускай сурёзнай думкі і творчэства маладых сіл, мы звернем асабліўую увагу на пачатковую стацьцю 2 кніжкі „Маладой Беларусі“, напісаную вядомым расейскім прафэсарам А. Погодіным,—„Беларускай Моладзі“.

Прафэсар звертаецца да маладых:

«Ці дажывецё с часам і вы тэй пары, калі кожын гвалт над станам (сословіем), родам, націей, верай ня будзе лічыцца якой-небудзь гасударственай заслугай, а будзе лічыцца тым, чым ён ёсць папраўдзі: брыдою і праступкам?»

„Мы лёгка прывыкаем да ўсяго, што дзеецца дужа часта навакола нас. Там, дзе мы сваімі вачыма не бачым скрыўджэнаго і церпячаго, нас сумленьне ня мучыць, асабліва тады, калі мы можэм супакоіць сябе, сказаўшы: «не я гэта зрабіў». Але крыўда заўсягды будзе крыўдай, і хто з ёю не змагаецца, той згаджаецца з ёю і пакрывае яе. Хітрае сумленьне заўсягды знойдзець выкрут. Не здарма-то Дон Кіхот ваеваў з ветракамі. Хто рупіцца аб сваім спакою, таму гэтые ветракі мігацяцца у ваччу і там, дзе ёсць рэальнае зло, с каторым *трэба змагацца.* І чым бы ні скончылося змаганьне з гвалтам і няпраўдай, усё-ж такі змогуць свабода і дабро: іначэй жыцьцё само сабе пярэчыло-бы і скончылося-бы, а гэта ж мы бачым, што жыцьцё трывае і хавае ў сабе насеньне вечнасьці. Вось чаму-то хацябы і цяжка прышлося у змаганьні, нельга вам ні апускаць рук, ні пакідаць барацьбы. Свабода асобы, свабода і роўнасць мужчыны і жонкі, свабода усякай націі і народу будуць такімі, якімі яны здалеюць стаць, і ў канцы канцоў сходаюць уселякіе перашкоды і насільствы.

„Вось чаму то вашы стараньня падняць нацыональнае пачуцьцё беларускаго народу будзяць у мяне жывую сымпатію, ня гледзячы ўжо на тое, чы удасцца вам гэта споўніць...

«Як зніштажэньне гнібеньня «націоналізму», як пробу высшаго ідэйнаго, культурнаго жыцьця чэлавечэства, як работу, карысную для змацаваньня, узбагачэньня і агульнаго падняцьця гасударства,—я вітаю працу беларускай моладзі, працу, ідучую да національнай прасьветы беларускіх масс. «Так, гэтай ідэяй варта жыць!»

Шчырые, гарачые словы расейскаго вучонаго і грамадзкаго працаўніка павінны дадаць нашай моладзі, што толькі пачынае брацца да работы, болей ахвоты і сіл. Наша справа—сьвятая справа. І голас прафэсара Погодіна ешчэ раз паказывае, што ад беларушчыны адрэкаецца толькі той, хто для свайго народу і для сваіх братоў—гаротнікоў нічога зрабіць ня хочэ.

*Б. С.*

---

## Беларуская вечарынка.

*27 студня.*

Вечарынка 27 студня была не звычайная: ставілі на сцэні першы раз «Паўлінка», сцэнічны абразок у двох актах Янкі Купалы. Перад публікай праходзілі тыпы дробнай, засьцянковай шляхты, каторых аўтор патрапіў жыва выразіць, выказаўшы гэтым вялікую знаёмасьць жыцьця беларускаго селянства; чуваць было, што гэта ня робленые, а жывые тыпы нашай вёскі.

І сцэна перэнесла герадзкую публіку у глухі закутак, чым навеяла мілы настрой.

Што да артыстоў, каторые ігралі на сцэні, то трэба сказаць, што некаторые з іх выказалі праўдзівы сцэнічны талент, але саўсім добра сыйграць некаторым перешкаджало тое, што ня ўмелі сваіх ролей. Відаць гэта было з лішне доўгіх паўз і таго, як гаманіў суфлер. Дрэнна і тое, што са сцэны калечылі беларускую мову, асабліва у жаноцкіх ролях. Гэта, што праўда, старая хвароба артыстоў Б. М Д. Кружка, але вялікі час з яе пачаць лячыцца.

Дэклямація зрабіла глубокае ўражэньне на слухачоў а найбольш „Абразкі“ Пётры Простаго і „Прарок“ Янкі Купалы, самі па сабе сільна напісаные.

Хор відаць сурьёзна працуе над беларускай песьняй, бо ад прапеяных на вечарынцы 4 песень мала што большаго можна жадаць у чым заслуга дырыгента хорам.

На вечарынку гэту сумысна прыехаў з далёку і аўтор яе Янка Купала. Аўтора публіка выклікала на на сцэну і абдзеляючы густымі воклясками падалі яму памятку—падарак ад віленскіх беларусоў залаты гадзіннік з надпісам: «аўтору „Паўлінкі“ віленскіе беларусы 27 студня 1913 г.» Артыстцы, каторая ігрaла ролю „Паўлінкі“ п. Маркевічанкшчынцы, аўтор падаў на сцэну букет з жывых кветак.

У салі у часе гульні панаваў дзіўны настрой: вось здавалося, што гэта адна, згодная сямейка сабралася на нейкае мілае сьвята, гэтак усім было вясёла і міла.

---

## Ідуць гады.

Ідуць сабе гады, ідуць,
Бы карагод бяз конца,
Што ў небі зорачкі вядуць
Ля месяцу, ля сонца.
Ідуць сабе гады, ідуць;
І чэлавек за імі.
—Куды цябе яны вядуць,
І сьцежкамі якімі?

—«Няведама мне скуль усё і што я;
Няведама мне сама сьцежка мая,
Няведама мне і куды я іду,
Пытаньня не маю ці што там знайду,
Няведаю жыцьце, ці шчасьце, ці не,
—Пачалося гэта, браток, не на мне.“

Ідуць гады, ідуць гады
І з імі ўсё на сьвеці.
Сягоньня ты, там йшлі дзяды,
А заўтра пойдуць дзеці.
Ідуць гады і ты ідзеш
У здагонь за імі, з імі.
—Нашто скажы мне ты жывеш
І з думкамі якімі?

—„Заднею думкай я ў сьвеці жыву
Настаўвікам ўзяўшы і лес і траву,
Крыніцы і кветкі, і цемню, і сьвет,
І месяц, і зоры, і сонца, прывет:
—Прысуджэны шлях свой рабі дарагім
Красуйся на радасць сабе і другім.

*Алесь Гарун*

---

## Лебядзіная песьня.

Плыла яна, лілась, як громы, так магуча
С прапоўненых грудзей, с прапоўненай душы;
Як ветры лёгкая, як буры, так кіпуча
Прамчалася кудысь ў пыстыннае цішы.
Мільёны тоноў там, у песьні тэй спляліся:
Любоў, ненавісць, гром, агонь і бура ўраз.
Той, с чыіх грудзей такіе зыкі паліліся
Раз першы у жыцьці пеяў, ды ўжо й апошні раз!
І змерлі тоны гдзесь ў пустыннай сумнай далі,
Бяз рэха расплыліс ў няведамым краю...
І горны оздух там, высока ўскалыхнулі...
А лебедзь?... Ен умёр сьпеяўшы песьнь сваю...

*К. Буйло.*

---

## Да роднай краіны.

І хочэцца мне верыць.
Ізноў усей душой,
Што ажывець вясною
Край родны, мілы мой.

Табе, мой краю родны,
Жыцьцё ўсё атдаю
Свае, і думкі, й песьні,
І ўсю любоў маю.

У табе мая уцеха,
Жыцьцё маё с табой,
Мая надзея й радасьць,
Край родны, мілы мой!

Я шчыра веру й жычу,
Што доўга будзеш жыць,
Што ворагі ўсе згінуць—
І сонцэ заблішчыць!...

*Я. Журба.*

### Трэба рэмесьленных школ

У Новым Пагосце (Дзіс. пав. Віленск губ.) даўно ужо ёсць народная школа але, для селян карысьці з яе не шмат, як і з усіх народных школ у каторых апрача чытаньня і пісаньня нічога ня вучаць. Праўда, сыны багацейшых селян, акончыўшы народную школу часам ідуць далей вучыцца і аканчываюць сярэднiерозные школы, але такіх, як памятаю, за гадоў дзесяць вышло можэ а то 10 і таго менш. Дзевяноста-ж дзевяць хлапцоу астаюцца, або у сёлах гаспадарыць, на бацькаўскім шнурочку, або ідуць на заработкі у гарады. І для гэтых апошніх школа нічога блізка што не дае. Сельская народная школа павінна даваць побач граматы дзецям і, хоць пачаткі, навукі патрэбнай у яго вясковым жыцьці, а значэ народная школа павінна вучыць хлапцоў рэмесла і сельскай гаспадаркі. Час навукі у народных школах разложэн цяпер на тры гады, можна было-б завясьці ешчэ чацьвёрты год навукі для старшых хлопцоў і каб у гэтым гаду вучылі або гаспадаркі або рэмесла. Праўда, на гэта патрэбен асобны вучыцель, каторы абойдзецца воласьці рублёў 400—500 у год. але гэтые грошы можна было-б сабрац с платы за навуку, скажэм, 50 хлопцоў кожны па 10 руб. Ахвотнікоў знойдзецца у нас колькі хочэш трэба, толькі, каб сьвятлейшые людзі у нашай воласьці, шырылі гэту думку і каб валасны сход пастанавіў аткрыць атдзел рэмесьленны пры тутэйшай народнай школі, а тамъ і казна ад сябе дасць падмогу.

*Пагашчанін.*

## Мінск.

### „Цэнные людзі".

Быўшы верхавод мінскіх чорнасоценцоў і кіраўнік „*Мінск. Русск. Слова*", пярэхрэст, Мэндэль Шофэр, которага выціснулі з Мінска, цяпер патрапіў улезьці у Пецербурскую паліцэйскую газэту „*Вѣстникъ Градоначальства*" ды ешчэ, нечым, кшталтам «Освѣдоміцельного бюро», пры упраўленьні аб справах друкоў. Ня дзіва, цяперэшнімі часамі гэткіе людзі у цане!..

### Новые парадкі.

Новы губэрнатар, Гірс, выпісывае сабе памочнікоў с Кіева, а новы еп. Мітрофан, з Могілева. Гэтак губэрнатар замяніў правіцеля канцэлярыі Петрова, даўней „ідэйнаго" верхавода у «Мінск. Русск. Сл.», на выпісанаго с Кіева і апрача гэтаго маніцца «чысьціць» усіх глаўных супрацоўнікоў быўшаго мінскаго губэрнатара Эрдэлі. Пакуль што губэрнатар выпісаў трох чывоў с Кіева: на правіцеля канцэлярыі—Кучэрявенко, на памочніка яго—Кірілова і на Мозырскаго маршалка дварноў, Перрэна. Еп. Мітрофан выпісывае з Могілева сьвяшчэнікоў акадэмікоў, замест тутэйшых па большай часьці сэмінарыстоў. Бедные, ім здаецца, што гэта паможэ на старые укараніўшыеся тут хваробы.

### Выборы у гарадзк. думу.

Ешчэ не выбіралі гарадзкога галавы, але мабыць, астанецца цяперашні п. Хржонстоўскі, катораму вясьці агітацію памагае паліція. Ведама, калі знойдуцца якіе конкурэнты, то не так ужо цяжка падвясьці іх над рубрыку «неблагонадзежных».

*Мікола Камароускі.*

### Апека.

Новы губэрнатар Гірс узяў пад сваю апеку чорнасоценную газэту „Мінск. Русск. Слово" Пакуль што «прыняты мѣры» дзеля расшырэньня гэтай «карыснай» газэткі цыркулярам за № 7431.

### Камэрчэскі інстытут.

Пішуць газэты, што праект, каб аткрыць у Мінску камэрчэскі інстытут, абецалі падтрымаць у Пецярбурзе у міністэрстві торгу.

### Дробны павер.

Губэрнскі камітэт у справах дробнаго паверу (крэдыту) пазволіў аткрыць паверные таварыствы у вёсках: Лясковічы, Людзеневічы, Жытковічы, Міхалаўцы і Скародні.

### Высяленьне жыдоў.

С прычыны просьбы жыдоўскай дэпутаціі, мінскі губэрнатар адлажыў да вясны высяленьне жыдоў з вёсак пінскаго і мазырскаго павету.

### Селянскі бунт.

23 сьнежня у в. Остраві, навагрудзкаго павету быў даволі вялікі селянскі бунт с прычыны раздзелу сэрвітутнай зямлі. У справе бунту, да катораго належало каля тысячы чэлавек, паліція арэштавала 18 чэлавек, як зачыншчыкоў і цягне ешчэ 40—50 чэлавек. Селяне напалі на кватэру каморнікоў і гразілі земскаму начальніку. Губэрнатар пасадзіў на сем дзён пад арэшт спраўніка і увольніў саўсім прыстава, затое, што яны былі малачыннымі у стлумленьні бунту. Прыгэтым трэба сказаць, што паліція затушыла бунт у с. Остраві не ужываючы аружжа.

### Тыфус.

У многа якіх мейсцах мінскай губэрні шырыцца пошэсць тыфусу, мэдыцынскай помачы мала.

### «Разумнымі спосабамі».

На заседаньні рэчыцкаго паветоваго земскаго сабраньня разглядалі пытаньне аб змаганьні с хуліганствам па вёсках. Праект змаганьня с хуліганствам, які падала паліція, сабраньне аткінуло і вынесло пастанаўленьне, што толькі як будзе заведзіна шырокае самоўпраўленьне, валасное і вясковае, пры учасьці усяго населеньня, можна будзе выгубіць разрост хуліганства па вёсках.

Шкода, што у Мінскай губэрні адно толькі рэчыцкае земства саўсім разумна паставіло гэту справу. Другіе земствы сказалі, што каб зменшыць хуліганства, трэба усіліць паліцію!..

---

## Гродна.

### Хаўрус гадоўлі жывёлы.

Пры гродзенскім Сельска-Гаспадарскім Таварыстве аткрыўся хаўрус гадаўлі жывёлы, з аддзеламі ва ўсіх паветах дагэтуль у хаўрус записана каля 4,500 кароў. На інструктара запрасілі П. К. Рыкоўскаго. Інструктар павінен аб'ежджаць усіх хаўрусьнікоў і тлумачыць, як трэба гадаваць і карміць жывёлу.

### Купля коней для аўстрыяцкай арміи.

У гор. Кобрыні (Гродз. губ.), штогоду адбываецца вялікі кірмаш на коні, але сёлета былі агенты для закупкі коней да аўстрыяцкай, румынскай і боўгарскай армій. Цэны плацілі за коней страшэнна высокіе, сярэдняя цэна за беларускаго каня дахадзіла да 300 руб., а за лепшых коней плацілі ат 500 да 800 рублёў. Колькі канёў купілі па 900 і па 1200 рублёў. За колькі дзён вязлі заграніцу цэлымі поездамі коней.

---

## Вітэбск.

### Перэсяленьне у Амэрыку.

С кожным годам з нашей губэрні што раз болей выежджае селян у Амэрыку, Гаворуць тут аб Амэрыцы, як аб залатым дне, дзе чуць што, не на кожным плаце вісяць бліны, а пад платом макалка стаіць. Памагаюць гэтаму розные агенты, каторые дзеля свайго заработку падманываюць цёмных людзей, раз'ежджаючы па вёсках і мястэчках. Ешчэ гады тры чатыры таму ніхто і ня ведаў тут аб Амэрыцы, а цяпер выежджаюць сотнямі. Перэселяюцца найбольш у Бразылію, дзеля таго, што Гутман агент наняты ад тамтэйшых багачоў распусьціў штат кніжэк па сёлах у каторых пішэцца, што у Бразыліі дзёшава земля, німа ніякіх падаткоў і т. д. Папраўдзі-ж было саўсім не так. Тым людзям, каторые перэсяліліся прыхадзілося дужа цяжка. У дадатку, як цяпер выясьнілося сам Гутман, меў там свае вялікіе плантаціі кавы. Палажэньне перэсяленноў каторые паехалі туды было страшэнна цяжкое; іх перэменялі у поўных нявольнікоў. У канцы канцоў крыўда, якую рабіў гэты Гутман перэсяленцам, звярнула увагу расейскаго консула у Ріо-де-Жанэйро, каторы аб гэтым паведаміў тутэйшые ўласьці. Апошнімі часамі гэты самы Гутман аткрыў кантору у Лондоні, аткуль пасылае агентоў і па ўсей Беларусі. Дык, перэсьцерэгаем усіх і просім перэсьцерэгаць другіх, каб сьцерагліся агентоў гэтаго пана, бо хто пападзецца у яго лапы будзе горш пад'ярэмнай скаціны, век будзе праклінаць сваю долю. Наагул, калі хто выбіраецца у Амэрыку, то можна ехаць туды толькі тады, калі мае там сваіх добрых знаёмых, каторым можна верыць, што яны не запрададуць чэлавека, як скаціну якую у няволю і калі яны напішуць, што можна мець там работу.

*О. Семігальскі.*

### Барацьба с хуліганствам.

Вітэбскае губэрнскае земскае сабраньне пастанавіло, прасіць правіцельства, каб менш пушчало у прадажу гарэлкі, бо ад пьянства шырыцца бедната і хуліганства. Дзякаваць Богу! хоць у адным мейсцы падумаліся з якой прычыны шырыцца хуліганства па вёсках. Толькі зменшыць адну прадажу гарэлкі мала, трэба даць ешчэ асьвету і самоупраўленьне.

---

## Магілеу.

### Будзяцца.

У гэтым гаду першы раз дайшоў беларускі календар у наш закутак (*Мілославічы*, Могіл. губ Клімовічск. павету). Былі такіе, што не

---

згмаху пачалі сыпаць на вуліцу, ажно тут Міхалка стаіць, гастапырыўшы рукі, пасярод вуліцы і стрымлівае гэту граmаду... Андрэй, замахнуўшыся, кінуўся да яго с крыкам: «Міхалка, ты?!»

— „Я", адазваўся Міхалка, стоячы над самым Андрэем. „Прачхніся, братка, патраўся надта нечага стогнеш,—мо баліць што?"

Андрэй падняўся, працёр кулаком вочы, палядзеў кругом, глянуў на Міхалку,—„а праўда, атказывае, мусіць то я дрэнна лежаў, страхі нейкіе мучылі мяне". і перэвярнуўшыся на другі бок, ціха і смачна заснуў... **Ядвігін Ш.**

---

# ГОРКІ АГРЭСТ.

Ля шляху, блізка паўвярсты у доўж, і споры кавалак у шыркі цягнуўся пекны сад селяніна Глячка, здаўна засаджэны ешчэ нябошчыкам дзедам.

Салодкіе яблачкі, уселякіх гатункоў ігрушы чорные і жоўтые сьліўкі, былі прынадай для тых, хто праезджаў шляхам у летку з засмягшымі вуснамі, ат гарачыні.

Глячок, як кажуць, у шапку не спаў, абы хвілінка часу, з рыдлёвачкай у руках ён то там, то сям поркаўся у садку: гдзе зямелькі падсыпе, гдзе падпорачку дась, і праз гэткі дагляд, у восень добра набіваў машну.

Бывала, часамі, хлопцы з суседніх вёсак у ноччы цярушылі смачвые яблачкі, і гэтым дужа гнявілі Глячка, трэба было толькі угледзіць на зямлі галінкі ат дрэва, гвалту ні абярэшься: «ня шкода яблака, але глум той на што, больш, таго лому, як крадзежы!» бурчэў цэлымі днямі Гляк і посьле у запар тыдзень, два, не вылазіў с саду.

Вось, неяк добра падпіўшы Гляк праз увесь дзень спаў у пуні, а прыйшла ноч, пашоў вартаваць сад узяўшы с сабою старшага сына.

Сон ня йшоў к яму, ведама выспаўся, ну, а каб нудна не было, лёг пузам на траве, ды пазіраючі у неба лічыў зоркі.

Толькі налічыў капу, і меўся узяцца за другую, ажно нешта зашасцела між кустоў і дзьве даўгіе цені папаўзлі к ябланьцы, што расла блізка агрэсту.

Гляк штурхель сына: Сымон, Сымон, чы чуешь? госці ёсь. Уставай! Сымон успахіўся, працёр вочы і расправіў свае пукатые плечы.

Ноч была не сусім цёмная, кругом было ціха, толькі з балота данасілося квакатне жаб. Раптам затрэслося дрэўцэ Як пачуў лопат яблачкоў Глячок угрыньнем панёсся па саду натыкаючыся на дрэвы, што густа расьлі з берагу.

„ Ах вы смарады, яж вас патрасу!" нямым голасам зароў Гляк, і як вадзень учарэпіўся за карк, злодзею.

Сын пагнаўся за другім, але той быў жасьцейшы: як кот шмыгануў праз пярэплаць і памінай як звалі.

Ну што-ж было рабіць з гэтым? Біць звычаю у іх не было, ну, а каб раз на заўсёды адвучыць красьці, казаў сыну сцягаваць з госьця нагавіцы і кашулю.

Спужаўся злодзей, ня ведаў што будзе, але посьле здаўся на тое: забіць не павінны ну, а калі улупяць, варт быў гэтаго.

Сцягнуўшы з гасьця «шаты» сын маўчком узяў за ногі перакінуў на другі бок агрэста, а бацька згроб за рукі пачалі пацягаваць голай сьпіной с канца у канец па агрэсту.

Той і прасіўся і маліўся нічога, але, як сказаў, што ён ві далекі сусед і першы раз на сваім жыцьцю памкнуўся красьці, даючы пры гэтым слова, што апошні раз,—пакінулі.

Госць—не чэкаўшы доўга, рвануўся у бок і ня гледзючы, што бяз дольнай апраткі, што маючы духу засакатаў па дарозі, а Гляк з сынам аж клаліся са сьмеху гледзючы адзін на другога.

Прыбегшы да дому бедак ня ведаў як легчы, як сесьці Глякоў агрэст як пісягамі распісаў усю сьпіну што ні сабе паглядзець, ні людзям паказаць, бо чаго добраго дачуюцца.

Так прайшоў дзень, другі, аж неяк у вечэры прыходзе кум і заве на хрэзьбіны „хадзем!"—адказу німа, пашлі.

Гасьцей шмат, поўна, як селядцоў у бочцы, хоць зачыні! Пьюць пяюць, ну ведама, як на хрэзьбінах.

«А, кум, і ты тут! Сюды, братка, сюды. Во с кім я выпью! адазваўся добра падпіты Арцём,—садзіся!»

Што рабіць, рад бы сесьці, ды гдзе-ж! Абы прыгнуўся, скура дзярэцца, як гарэлая анучка.

„Дзякую, дзядзячка, я так сабе—стоючы"... А сам, аж гарыць ат сораму. Во,—сабе думае,—схадзіў у яблакі завёў сябар, каб ён выдах!..

„Ну ды як жэ, няўжо стоючы будзэш есці? Гэта-ж і у паноў гэткага звычаю німашыка!" адазваўся кум.

„Садзіся, дзядзька, на бойся. Гукнуў с печы хлапец". Садзіяся, тут жэ адрэсту німашыка!

Як бы апарылі бедака! Здаецца, хата кружылася, кружылася, а посьля паляцела некуды разам з гасцьмі. Азірнуўшыся назад ён угледзіў шапку, хапіў яе бардзей і пад рагатню гасцей, як куля, выляцеў з хаты і што маючы духу пабег у канец села.

Бег ня помніў куды, азірнуўся толькі тады, як бяз духу прыпёрся ужо к нейчай пярэплаці.

Аж і тут перашкода; ні паспеў атсапціся, аж чуе нейчы голас, «куды, дзядзька, чы не па агрэст? Валі к Гляку, там за адно і шганы забярэш».

Узарваўся ізноў і загайсаў з новай сілай да дому, і чым часьцей перабіраў нагамі, тым мацней нехта крычаў на вуха: садзіся, дзязечка, садзіся, тут жэ агрэсту німашыка!..

**Галубок.**

